Прачытай сам і перадай другому.

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 87 (4545)

3 лістапада 2020 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

Да ўвагі!

Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

НА СЛОВАХ...

Александр ЛУКАШЕНКО:

«Кто-то хочет, чтобы милиция и военные ушли из Минска? Этого не будет, пока я Президент… Это мои функции и полномочия – защитить покой и мир наших граждан. Так будет и впредь. Они должны это знать».

... И НА ДЕЛЕ

Минск, 1 ноября 2020 года









МІНСК, 1 ЛІСТАПАДА 2020 ГОДА

Нельга знішчыць памяць пра ахвяр сталінізму

Нягледзячы на абсалютна незразумелыя дзеянні амапаўцаў і тых, хто іх нацкоўвае на мірных людзей, 1 лістапада ў Мінску прайшоў чарговы нядзельны марш. Па сутнасці, гэта было традыцыйнае штогадовае шэсце ў Курапаты, якім шырокая грамадскасць адзначае і "Дзяды", і трагічную дату расстрэлу ва ўрочышчы пад Мінскам многіх дзясяткаў знакамітых асоб, якія з'яўляліся красой беларускай інтэлігенцыі, гонарам нацыі.

На жаль, далёка не ўсім удалося ў нядзелю дабрацца ў Курапаты, якія даўно сталі мемарыялам. На полі побач з пахаваннямі ахвяр сталінізму сілавікі зладзілі самае сапраўднае сафары – ганяліся за людзьмі на аўтамабілях, тых, каго даганялі, жорстка збівалі.

Усяго ў нядзелю былі затрыманы больш за 310 чалавек.





НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

Страшный сон

Казалось бы, после заявлений с самого верха о том, что «пленных не брать и рубить руки», дальше уж некуда. Оказывается, есть еще что предпринять. В минувшее воскресенье власть организовала не просто недопуск людей на кладбище в Куропаты, но устроила настоящую охоту на стремившихся попасть туда. Снова перегороженные улицы, опять стрельба, гранаты, снова автозаки, беготня по дворам, задержания…

Я не возмущаюсь действиями властей. За три прошедших месяца чему только свидетелями мы не были! Вроде и удивляться нечему. Но не могу не думать: а что же дальше? Заполненные людьми, как во времена Пиночета, стадионы? Представляете минский стадион «Динамо», до верхних рядов заполненный этими «протестантами»? Конечно, жаль, что у нас нет своей Сибири с ее лагерями. Сослать бы туда двести или триста тысяч «беспокойных», и всё стало было хорошо. Тихо. Но Беларусь маленькая страна. Нет своей Сибири. Лагеря и новые тюрьмы строить накладно. Бюджет и без того трещит.

Можно было бы прибегнуть к массовым расстрелам. Но не те времена. Запад не позволит. Рядом Польша, Литва… Да и Путин может поморщиться.

Тяжело главнокомандующему. Тяжело его генералам. Вдруг выяснилось, что вроде бы такой тихий, такой толерантный народ, что его лучше «народцем» называть, совсем даже не тихий и не очень-то толерантный. А даже буйный. Нет, они, конечно, культурные люди. Прежде чем на лавки встать, даже обувь снимают. Но ведь неуправляемые. Им твердят: нельзя, санкции нет на ваши шествия-марши. Культурно объясняют им люди в шлемах и с дубинками. А они вроде как не слышат, вроде как оглохли. Идут себе и идут. Как у себя дома. Вроде даже как считают, что и города их и улицы им принадлежат. Что у них есть какие-то права. Рисуют это бело-красно-белое где хотят. Флаги запрещенные развешивают.

Странный народ. И когда они успели стать такими? Еще недавно были такими послушными, от одного взгляда правителя цепенели. А теперь распустились, вообразили о себе невесть что. Говорят, выросло новое поколение. Смелые, ничего не боятся, с чувством собственного достоинства. Значит, плохо велась воспитательная работа. Народ должен бояться власти. Поэтому заменим ректоров и деканов, выгоним неугодных преподавателей и студентов. И обязательно закроем границы, чтобы неугодные элементы не шастали туда-сюда.

Даже некоторые академики и артисты распустились. Посадить такого академика или оперного певца на 15 суток на Окрестина, а потом еще суток 30 добавить – поглядели бы тогда, что бы они заговорили и запели. Но ведь крик-шум поднимется! Опять же с кредитами-инвестициями дело нынче совсем плохое.

Самое лучшее было бы, конечно, заменить народ. Скажем, тихих, работящих людей из Толочинского района переселить в Минск, а жителей Минска – в Толочин. Но больно дорогостоящая операция. Да и ОМОН может не справиться.

Кстати, об ОМОНе. Ребята вроде правильные, верные. Зарплата не то что у какого-то занюханного доцента, не говоря о работяге с МТЗ, опять же кредиты дешевые, жилье сразу же, форма дорогая, дубинки самоновейшие. Да что там дубинки! Все наисовременнейшее для битья и усмирения народа, что только появляется в мире, сразу Беларусью закупается. Все эти водометы, автозаки. Для народа ничего не жаль. Но вот точит правителеву голову мысль: а вдруг перекинутся, вдруг изменят?

Поэтому усилить идеологическую работу. Ежедневно разъяснять насчет врагов. Брать на службу только с комплексами неполноценности, обозленных, жестоких, лучше малограмотных. Таких, которым ударить старика палкой по голове, избить студента – наслаждение.

Но ведь и бьют, и на сутки сажают, и сроки дают, а они все ходят и ходят. Поневоле начинаешь думать о том, что Беларусь плохо географически расположена. Ну была бы она, к примеру, как Гаити, – остров. Ведь не случайно там режим клана Дювалье с его тонтон-макутами тридцать лет продержался. Все-таки остров – попробуй доберись до него. Правда, рухнула власть этого клана, пришла и на остров этот проклятая демократия. Наверняка что-то было упущено. Ведь столько лет держались.

Но Северная Корея держится. А все потому, что маленький отъединенный кусочек на Дальнем Востоке. От Южной Кореи четко отгородились.

А с Беларусью что делать? Обступила вражья сила – деваться некуда. Ну Польша с Литвой – это явные и давние враги. Но ведь и Украина недобро смотрит в белорусскую сторону. И даже друг Путин что-то себе позволяет в адрес партнера по Союзному государству. А недалеко и Западная Европа, Германия и Франция с их чертовым Евросоюзом. Тяжело, ох как тяжело управлять Беларусью в таких условиях!

И снится правителю сон. Толпы народа на улицах Минска. Кипение бело-красно-белых знамен. Он отдает приказ ОМОНу. А никто не выполняет приказ. Нету ОМОНа, разбежался. Предали все-таки. И тогда он один выходит с «калашниковым» на площадь перед дворцом. Один, всеми покинутый, сбежал ОМОН, сбежали министры, генералы. И «калашников», как выясняется, без зарядов.

А люди со всех сторон прибывают. И вот уже над Дворцом Независимости взвивается бело-красно-белое знамя.

БЕЗ РОЗОВЫХ ОЧКОВ

Александр КЛАСКОВСКИЙ

С кем родство?

Позавчера было обычное минское воскресенье: снова звучали выстрелы (слава богу, только в воздух или резиновыми пулями), взрывы (судя по всему, светошумовых гранат). Силовики на фирменных синих бусиках гонялись за людьми прямо по полю у Куропат, молотили дубинками. Этакая дикая охота в духе голливудских хорроров.

Воскресная жесть «блюстителей» выглядела особенно нелепо. Ладно уж, когда перекрывают центр, где много всяких административных зданий. Или подступы ко Дворцу независимости – властной цитадели Александра Лукашенко.

Но 1 ноября марш мирных граждан был изначально нацелен в противоположную сторону, на Куропаты – место за Минской кольцевой, где в 1937-м палачи НКВД стреляли в затылок «врагам народа». Манифестанты шли почтить память жертв сталинизма.

Оказывается, и это нельзя. Больших белорусских начальников априори колбасит от любой несанкционированной уличной активности. Тем более сейчас, когда страну охватил острейший политический кризис. Потому и в святой день поминовения предков «Дзяды» была включена полицейская, репрессивная логика.

Лукашенко не раз вступался за Сталина. Власти преследовали защитников народного мемориала в Куропатах, весной прошлого года потрясли общество диким выкорчевыванием поставленных ими в этом скорбном месте крестов. Нет официальных свидетельств, что Лукашенко за 26 лет правления хоть раз отдал дань памяти жертв сталинизма в Куропатах.

Попытки же оправдать сталинизм идут от того, что нынешний белорусский режим ощущает духовное родство с той системой. Он также проникнут вождизмом, нетерпим к инакомыслию, убивает политическую конкуренцию и стремится подавить всех несогласных с генеральной линией.

Другое дело, что в XXI столетии в центре Европы не развернешься так, как мог в свое время Виссарионыч. Лукашенко не раз повторял, что у него нет ресурса для диктатуры. Заметьте: речь не о том, что быть диктатором в принципе не комильфо, что этому мешают какие-то моральные тормоза, а просто – нет ресурса.

Впрочем, зашкаливающие репрессии последних месяцев, пытки в застенках, язык войны в устах вождя и его служак, поиск врагов народа и конфронтация с внешним миром показывают, что нынешний белорусский режим недалеко ушел от сталинизма. А может, к нему приближается.

БЕЗ РОЗОВЫХ ОЧКОВ



Александр КЛАСКОВСКИЙ, политический обозреватель

В воздухе запахло гражданской войной

Александр Лукашенко и его генералы уже которую неделю, как карамельку во рту, обсасывают, смакуют слово «война». Чувствуется: это их стихия. Если идет война, значит, на той стороне – враги, а с врагами не цацкаются. Так проще, понятнее, это развязывает руки.

Выступая 30 октября перед сотрудниками МВД, Лукашенко много раз повторил слово «война», говорил о предательстве, пытался связать участников протестов с фашизмом. Апофеозом же стала фраза, что с сегодняшнего дня «мы в плен никого не берем».

Идеология войны вбивается в мозги силовиков. Министр обороны Виктор Хренин заявляет о гибридной войне. Здешним начальникам не только с народом, но и со странами-соседями не повезло: все, гады, точат зубы.

Да что там соседи – вся планета, почитай, враждебна. Из речей Лукашенко вытекает, что друзей у нас почти нет (на практике – только Россия, да и то когда дает деньги), а недругов да завистников – наоборот, как собак нерезаных.

То же видение – в категориях врагов, заговоров, войны – распространяется и на внутриполитическую ситуацию.

Начальники в погонах твердят о радикализации протестов, неких страшных боевых рогатках на вооружении оппонентов, зловещем намерении одного из противников режима распылить ядохимикаты с какой-нибудь высотки на боевые порядки ОМОНа и внутренних войск...

Высокое начальство демонизирует соотечественников с иными политическими взглядами. В пропагандистском дискурсе (а пропаганда в госСМИ абсолютно отвязалась и пробивает дно за дном) это уже не люди, а какие-то исчадия ада. А по нечисти и пальнуть как бы не грех.

Понятно, пугают оружием прежде всего для того, чтобы отбить охоту выходить на улицу с лозунгами против вождя. Но вся эта военная риторика не безобидна. Она заводит, распаляет самих говорящих и внимающих им подчиненных, психологически дает им карт-бланш. Это нагнетание психоза.

Если на сцене висит ружье, то в последнем акте оно непременно выстрелит. «А когда стрельба пойдет, пуля дырочку найдет».

В противостоянии, развернувшемся после «выборов» 9 августа, уже есть убитые. Теперь же, как считают многие обозреватели, в воздухе запахло гражданской войной.

И если страна к ней действительно сползает, то ответственность за это лежит на властях.

ТАМ, ЗА РЕШЕТКОЙ

Виктор Бабарико находится в очень непростой обстановке…

На минувшей неделе адвокаты обжаловали очередное продление срока содержания под стражей Виктора Бабарико. Этот срок недавно был продлен ему до 18 декабря. Дата судебного заседания по жалобе защиты пока не известна.



– Законных оснований для того, чтобы содержать Виктора Бабарико под стражей, стороне защиты не известно, – *считает адвокат* **Дмитрий Лаевский**. – Их не было в июне, нет и теперь. Обращаю внимание, что простое копирование статьи кодекса в постановление следователя вовсе не делает такое постановление законным.

Во-вторых, никаких конкретных обстоятельств, которыми бы объяснялась необходимость применения к нашему подзащитному вообще какой-либо меры пресечения, не было указано ни в постановлениях, ни сообщено в судах. Хотя закон обязывает такие конкретные обстоятельства назвать. Никаких доказательств, которые бы подтверждали основания для заключения под стражу, не названо и ни разу не представлено в суд. Хотя закон обязывает доказать, что обвиняемый может скрыться или помешать расследованию. Тут важно отметить: постановления следователя не являются доказательствами. Поэтому сколько бы постановлений не было вынесено, это никак не является доказыванием. Доказательства – это показания, экспертизы, вещдоки и прочие источники сведений о фактах, а ничего подобного по вопросу меры пресечения мы в данном деле не наблюдаем.

В-третьих, по закону при продлении срока содержания под стражей орган уголовного преследования должен обосновать невозможность или недостаточность применения иных мер пресечения. Иными словами, если бы даже основания для меры пресечения имелись, то тогда почему именно заключение под стражу, а не, например, домашний арест или личное поручительство? Тем не менее достаточность иных мер пресечения не опровергнута органами уголовного преследования.

Что касается обвинения, то, как мы уже неоднократно обращали внимание, оно даже с точки зрения формулировок неубедительно, не соответствует требованиям закона и вызывает бесчисленные вопросы – не описывает даже конкретных инкриминируемых действий. Напомню, что сторона защиты категорически отвергает все обвинения и не согласна с ними. А то, что орган следствия за более чем 4 месяца не сформулировал конкретное инкриминируемое деяние, тоже говорит о неприемлемости заключения под стражу.

Если вспомнить, что ранее правозащитным сообществом и международными организациями обращалось внимание на связь уголовного преследования Виктора Бабарико с реализацией им политических прав, то вопросов возникает еще больше. Да и, собственно, весь процесс расследования с июня сопровождается обстоятельствами, которые не соотносятся с моими представлениями о законности в уголовном процессе.

Поэтому защита в очередной раз обращает внимание на то, что задержание и заключение Виктора Бабарико под стражу является незаконным и необоснованным, а с точки зрения Международного пакта о гражданских и политических правах – произвольным. В связи с этим мы просим суд поступить в соответствии с принципом верховенства права и отменить заключение под стражу.

Что касается условий, то надо сказать, что Виктор Дмитриевич находится в очень непростой обстановке. Но он держится мужественно и, несмотря ни на что, настроен бороться, потому что нет таких обстоятельств, за которые ему стоило бы чувствовать вину, убежден в правильности своих решений, ощущает поддержку людей и испытывает чувство национальной гордости за белорусов.

СТАЛО ИЗВЕСТНО...

Власова и Путин рассекретили причину, почему Виктор Бабарико остается за решеткой

Хотя сразу после встречи в СИЗО КГБ Александра Лукашенко с политзаключенными было сообщено, что ее участники согласились на неразглашение подробностей разговора, на сегодняшний день многое уже известно. Вышедшая на свободу адвокат Лилия Власова сказала: *«Для Виктора Бабарико были озвучены конкретные условия выхода* (из СИЗО. – **Ред.**). *Я, наверное, не имело права сказать их, но они были озвучены на этой встрече»*.

Завесу секретности общения А.Лукашенко с теми известными лицами, которые без суда оказались в неволе, полностью приподнял президент России Владимир Путин. На днях он прокомментировал ситуацию, сложившуюся в Беларуси, при этом сказав, что *«Александр Лукашенко предлагает внести поправки в действующую Конституцию или выработать новый документ, а после этого на базе этих правовых норм провести новые парламентские и президентские выборы в Беларуси. Однако представители оппозиции от участия в этом пока что отказываются и продолжают находиться в СИЗО КГБ»*.

Все понятно: Виктор Бабарико не согласился с Лукашенко, который вместо ухода в отставку навязывает обществу свой план действий – вначале реформирование Конституции, а затем проведение парламентских и президентских выборов. Он как будто не знает, что широкая общественность не может смириться с фальсификацией итогов голосования 9 августа и что после этого миллионы людей не считают его легитимным президентом и требуют от него покинуть главный пост страны. И Виктор Бабарико, как и его сидельцы-соратники, конечно же, не согласен на предложения Лукашенко, а потому, как открыто сказал В.Путин, остается в СИЗО КГБ.

Антон СИДОРОВИЧ.

ВЗГЛЯД СО СТОРОНЫ

Станислав БЕЛКОВСКИЙ:

Уже скоро Лукашенко, я думаю, начнет настоящий погром силовиков

Он полностью переходит на режим управления в духе латиноамериканской хунты

Известный российский политтехнолог и публицист в авторской передаче на радио «Эхо Москвы» оценил ближайшие перспективы Александра Лукашенко.

Александр Григорьевич закручивает гайки. Грозится оторвать руки каждому белорусу, кто будет нелоялен к силовику. Он даже поменял министра внутренних дел, потому что старый министр, видимо, уже недостаточно надежен.

Это нормальное параноидальное состояние диктатора, близящегося к концу своего режима. Уже скоро он, я думаю, начнет настоящий погром силовиков, потому что очень мало кто в его понимании останется верен ему по-настоящему и готов идти до конца. Александр Григорьевич Лукашенко, как вы знаете, назначил гауляйтеров в регионы, которые должны подавлять любые проявления несогласия с ним.

В общем, он полностью переходит на режим управления в духе латиноамериканской хунты, убедившись в том, что народ Беларуси его всё равно не поддерживает, несмотря ни на что. Больше никаких конструктивных действий он не предлагает, и напрасно.

Он, видимо, еще рассчитывал на то, что Владимир Путин введет войска, но и Владимир Путин не вводит войска, поскольку, как мы неоднократно с вами говорили, Путин не любит Лукашенко и не желает ему долгой пролонгации полномочий, что бы публично ни заявлялось и ни провозглашалось.

И вот Александр Григорьевич мог бы взять пример с президента Венесуэлы, находящегося в схожей ситуации, – Николаса Мадуро, который на уходящей неделе решил легализовать гей-браки. Действительно, если у Александра Григорьевича Лукашенко нет больше поддержки в своей стране, надо как-то мобилизовать международные ресурсы. Нужно легализовать гей-браки и легкие наркотики. Тогда Беларусь буквально станет Меккой для ряда сильных международных лоббистов этой тематики.

Например, совместный концерт нескольких признанных гей-звезд во главе с Элтоном Джоном на стадионе в Минске станет переломным событием в текущей судьбе Александра Григорьевича Лукашенко. Та же Гвинет Пэлтроу может приехать его поддержать, поскольку сейчас она является одним из активных борцов за легализацию каннабиса и сама инвестор в проект, связанный с производством различных каннабиноидов.

Так что здесь Александру Григорьевичу Лукашенко нужно расширить сознание и действовать в этом направлении. Если же он так действовать не собирается, надо задуматься о досрочных выборах президента, о переходе к парламентской республике, формированию некоего коалиционного правительства, в том числе, возможно, с участием фигур, представляющих крупный российский капитал, уже в 2021 году. Александру Григорьевичу выбирать.

СЛЫШАЛИ?

Присоединились к стачке

Вчера появилось сообщение, что на «Беларуськалии» присоединились к стачкому еще четыре человека. Среди них двое шахтеров – машинисты горных выемочных машин **Валентин Скарбич** (2-е рудоуправление) и **Андрей Федорович** (1-е рудоуправление), а также горнорабочий очистного забоя Краснослободского рудника **Вячеслав Бородич**. Пополнил ряды стачкомовцев и представитель ИТР – инженер-конструктор **Павел Павлов**.

Они, как и все остальные участники стачки, требуют ухода с президентского поста А.Лукашенко, прекращения насилия над участниками мирных протестов, проведения новых выборов.

Лариса НАСАНОВИЧ.

ЗА ПРАХАДНОЙ

Едуць штрэйкбрэхеры…

Генеральны дырэктар ААТ “Гродна Азот” Ігар Бобыр заявіў, што першая група рабочых у складзе 40 чалавек едзе да іх на прадпрыемства і гатова прыступіць да працы замест тых, хто прымае ўдзел у страйку. Група сфарміравана са спецыялістаў з Гомеля, Магілёва і Наваполацка.

Тэлеграм-каналы паведамляюць, што спецыялістам з іншых рэгіёнаў прапанавалі заробак у 2 тысячы рублёў і пражыванне ў заводскім прафілакторыі.

Нагадаем, што ў мінулы панядзелак, 26 кастрычніка, частка рабочых “Гродна Азот” вырашыла далучыцца да агульнанацыянальнай забастоўкі. Раніцай больш за 100 чалавек сталі перад прахадной і не ішлі працаваць. Іх на тэрыторыю прадпрыемства запіхваў АМАП. Тым не менш у некалькіх цэхах рабочыя адмовіліся прымаць працоўную змену, а тыя, хто адпрацаваў у начную, не маглі яе здаць.

У аўторак з'явілася інфармацыя, што частка рабочых застаецца на сваіх працоўных месцах, бо не могуць здаць змену. Сітуацыя паўтарылася і ў наступныя дні. Аднак з'явілася і інфармацыя аб звальненнях тых, хто не хацеў прымаць рабочую змену.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ЗНАЕТЕ ЛИ ВЫ, ЧТО...

Внуку экс-ректора Белгосуниверситета дали 10 суток

Владислав Козулин – студент второго курса факультета прикладной математики БГУ, его задержали во время одной из недавних акций протеста. Некоторое время Влад был на Окрестина, а затем его отправили в Жодино.

«Влад не вернулся сегодня домой... – сообщила дочь Александра Козулина Ольга вечером 25 октября. – *В свете того, что на улицах города орудуют бандиты, это настоящий ад для матери – не знать, где ее ребенок находится и что с ним сейчас делают! Здоров ли... Жив ли...»*

Позже Ольга узнала, что Влад на Окрестина, вместе с ним еще 44 человека...

Суд состоялся на следующий день – как теперь модно, онлайн, по скайпу.

«Поеду в среду забирать, – сказал «Народной Воле» **Александр Козулин**. – *Внуку 18 лет, в декабре исполнится 19. Как он там в местах лишения свободы? Парень, который сидел вместе с ним и недавно вышел, позвонил Ольге. Влад просил передать маме, чтобы не переживала. Говорит, что все в порядке, интеллигентная публика, все друг друга поддерживают и всё нормально.*

Посмотреть на жизнь с обратной стороны – оно никогда не помешает. Лучше доходит до людей, что на самом деле происходит. Это только кажется, что всё нормально. А когда сталкиваешься с этой цепочкой – от момента задержания и до момента выхода, – понимаешь, что систему надо менять. В этой цепочке, к сожалению, сегодня вся суть нашего государства. Безусловно, это не самый лучший опыт. Но посмотрите, сколько за последние месяцы людей прошло через этот этап, и эта стадия важна – как момент очищения, после которого придет главное – осознание...»

Марина КОКТЫШ.

УТРАТА

Не стало Владимира Карягина…

Вчера, 2 ноября, в Минске на 69-м году жизни скоропостижно умер многолетний глава бизнес-союзов, председатель Высшего координационного совета СЮЛ «Республиканская конфедерация предпринимательства» Владимир КАРЯГИН.



«Предпринимательство Беларуси понесло огромную утрату, – говорят коллеги Карягина. – *Владимир Николаевич – инициатор сотни проектов и просто хороший человек. Соболезнования родным и близким. Светлая память!»*

У Карягина был коронавирус.

ВОЗВРАЩАЯСЬ К НАПЕЧАТАННОМУ

Юрий ВОСКРЕСЕНСКИЙ:

«Хорошо, когда любое мнение подтверждается фактами…»

В «Народной Воле» за 27 октября напечатано интервью политолога Юрия Воскресенского под заголовком «Вы тут на воле немного «берега попутали»…». Чтобы дать читателям более полное представление о собеседнике, который недавно вышел из СИЗО КГБ и сегодня является довольно публичной фигурой, мы решили дополнить интервью материалом сайта *KYKY.org* «Никогда такого не встречал». Ю.Воскресенский, увидев его на страницах «Народной Воли», решил сделать свой комментарий. Что ж, плюрализм мнений как раз вписывается в основные правила нашей редакционной политики.

Юрий ВОСКРЕСЕНСКИЙ:

– Сразу замечу, что в «Народную Волю» попал не полный вариант материала, появившегося на сайте *KYKY.org*, а с купюрами. Те пассажи, которые вызвали у меня протест и сайту пришлось оперативно дать опровержение, в публикации на страницах «Народной Воли» отсутствуют. Но не всё то, что из оставшегося предложено вниманию читателей уважаемой газеты, я считаю объективным и обоснованным. В частности, такие слова, как *«мог подставить коллегу»* или, например, *«интересы собственные для него были всегда выше интересов компании»*, должны подтверждаться фактами. Из почти 1200 контактов моей телефонной книжки, уверен, не найдется ни одного человека, который подтвердит подобные фразы. Очень интересно также, какая компания подтвердит выпад насчет превалирования *«собственных интересов»*, если у меня в наличии письменные благодарности и рекомендации от собственников всех предприятий, где я работал. Так что любое мнение, считаю, должно подтверждаться фактами.

Народная Воля http://www.nv-online.info
3 ЛІСТАПАДА 2020 г.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Як на плошчы Свабоды ў Ракаве была растаптана свабода выбару

Трыста гадоў таму, у Вялікім Княстве Літоўскім, Ракаў быў горадам з даволі развітай прамысловасцю. Чаго тут толькі ні выраблялі – цэглу і посуд, сячкарні і малатарні, мэблю і дзіцячыя цацкі, тут друкавалі кнігі і варылі піва.

У міжваенны час, у складзе Рэчы Паспалітай, Ракаў стаў мястэчкам, цэнтрам гміны і, знаходзячыся на саменькай польска-савецкай мяжы, праславіўся як сталіца кантрабандыстаў. Гэта пра Ракаў і ракаўчан напісаў свае знакамітыя раманы ("Каханак Вялікай Мядзведзіцы" і інш.) Сяргей Пясецкі, заслужана ўшанаваны тут мемарыяльнай дошкай. Напісаў па-польску, але беларускія рэаліі і досціпы сустракаюцца ў тых раманах ледзь не на кожнай старонцы. Напрыклад, сядзяць два мястэчкоўцы ў карчме, і адзін другому загадвае загадку: "Што такое беларускі аўтамат?". Яго субяседнік чухае патыліцу і чуе з-за суседняга стала падказку: "Беларускі аўтамат – гэта вілы: адзін удар – тры дзіркі".

Сучасны Ракаў – не горад, не мястэчка і не вёска. Паводле апошняга адміністрацыйна-тэрытарыяльнага рэгулявання ён займеў не зусім зразумелы статус аграгарадка ("гыргыргарадок" – як вымаўляла адна бабуля прыдуманае ў чыноўніцкіх кабінетах слова). Але ранейшы вольналюбны дух (без прыстаўкі "агра") у гэтым слаўным паселішчы застаўся. Нездарма ў Ракаве ёсць плошча Свабоды, дзе пасля пераломнага ў гісторыі Беларусі 9 жніўня ракаўчане і адстойвалі сваю свабоду. Свабоду выбару.


Марыя Калбянкова не падпісала фальшывы пратакол.


Кіраўнік Валожынскага райвыканкама Яўген Круковіч не пажадаў сустрэцца з ракаўчанамі.



Раман Гардзяюк – ракаўскі праўдашукальнік.


Ганна Віктаровіч старшынявала на выбарчым участку №19.

У размешчаным на плошчы сельвыканкаме знаходзіўся выбарчы ўчастак №19. У дзень галасавання на ім доўга не вывешвалі выніковы пратакол, а калі нарэшце вывесілі, выбаршчыкі абурыліся. Лічбы ў тым пратаколе выглядалі наступным чынам: за Андрэя Дзмітрыева – 29 галасоў, за Ганну Канапацкую – 26, за Аляксандра Лукашэнку – 1426, за Святлану Ціханоўскую – 84, за Сяргея Чэрачня – 16 бюлетэняў. Абурэнне выклікалі дзве лічбы – за трэцяга і чацвёртага кандыдата. Бо калі стыхійна на плошчы сабраліся ўсе тыя, хто прагаласаваў за Ціханоўскую, іх аказалася больш за 200! Адкуль жа ўзялася лічба 84?

Да сённяшняга дня не ведае пра гэта і член выбарчай камісіі №19 **Марыя Калбянкова**, з якой мы сустрэліся ў Ракаве на той жа плошчы Свабоды. Паводле слоў Марыі Вікенцьеўны, яна 47 гадоў адпрацавала ў Ракаўскім сельвыканкаме (раней – сельсавеце), з 2005 года – у выбарчых камісіях, але такога ўціску і гвалту, як вечарам 9 жніўня, не бачыла ніколі.

Толькі ў тым стосе бюлетэняў, якія лічыла сама Марыя Калбянкова, 401 быў за Ціханоўскую. Калі ж старшыня камісіі **Ганна Віктаровіч** (дырэктар мясцовай школы) прынесла на подпіс выніковы пратакол, Марыя Вікенцьеўна, зірнуўшы ў яго, вачам сваім не паверыла. І – адмовілася ставіць свой подпіс. Разам з ёю запратэставалі яшчэ двое чальцоў камісіі (з 19-ці) – Валянціна Дзянісік і Таццяна Міхонская. Тут і разгарэўся сыр-бор.

Тром жанчынам было заяўлена: пакуль не падпішаце, з выканкама, дзе ўжо з'явіліся сілавікі, не выйдзеце. "Як я магу падпісаць відавочную хлусню? – спрабавала апеляваць да старшыні камісіі Марыя Вікенцьеўна. – Я ж верніца, я ж у касцёл хаджу!" – "Гэта непераканаўчы аргумент, падпісвайце!" – насядала Ганна Віктаровіч. "Калі мы падпішам, нас людзі на плошчы разарвуць!" – хапалася, як за саломінку, за больш "пераканаўчы аргумент" Марыя Калбянкова (на той час каля сельвыканкама ўжо сабралася шматлікая людская грамада). Уціск працягваўся…

Урэшце Дзянісік і Міхонская здаліся і падпісалі сфальсіфікаваны пратакол. Націснуць на іх было не дужа складана – адна працуе медсястрой, другая – у тым жа выканкаме. Пенсіянерка Калбянкова (гонар ёй і пашана) свой подпіс так і не паставіла, яе сумленне засталося чыстым.

Самае цікавае, што сама яна 9 жніўня галасавала за… Лукашэнку, паколькі ўсіх астатніх прэтэндэнтаў лічыла выпадковымі ў палітыцы людзьмі. Пытаюся: ці аддала б сёння голас за таго самага кандыдата? Жанчына ажно змяняецца з твару. *"Ні за што! У мяне за апошнія два месяцы нібы вочы на ўсё адкрыліся"*, – прызнаецца Марыя Вікенцьеўна Калбянкова – адзіны сумленны член ракаўскай выбарчай камісіі.

Відавочнай фальсіфікацыяй на ўчастку №19 зацікавіўся малады ракаўчанін **Раман Гардзяюк**. Лёгка знаходжу яго дом па вывешаным на франтоне бел-чырвона-белым сцягу. Дзень 9 жніўня яму запомніўся ў драбніцах: *"Галасаваць я хадзіў, апрануўшыся ва ўсё белае, і на ўчастку пабачыў вельмі многа людзей у белым адзенні, з белымі стужачкамі на руках, у добрым настроі. Я думаў, што заўтра мы ўсе прачнёмся ў новай Беларусі. Прагаласаваўшы, я паехаў у Мінск, да сябра, які быў назіральнікам на адным з участкаў. Мяне здзівіла і насцярожыла вялікая колькасць аўтазакаў у розных кропках горада. Паўсюль міліцыя… Каля 150 чалавек на ўчастку, дзе мы знаходзіліся з сябрам, чакалі вынікаў. І тут прыехаў АМАП, каб вывезці камісію. У гэты момант мне стала зразумела, што заўтра іншай Беларусі не будзе"*.

У Ракаў Раман вярнуўся на наступны дзень і пачуў, што яго землякі збіраюцца вечарам на плошчы. Вырашыў далучыцца да грамады і ўпершыню ў жыцці лоб у лоб сутыкнуўся з сілавікамі без апазнавальных знакаў. *"Іх было 8–10 чалавек – у бронекамізэльках і касках, з дубінкамі. Яны запатрабавалі разысціся. Людзі абурыліся, сілавікі сталі іх затрымліваць. Мяне таксама двое ў форме ўзялі пад рукі, замахнуліся дубінкай, праўда, не білі. Павялі да аўтамабіля, але нам насустрач выбегла невядомая мне жанчына і стала крычаць: "Адпусціце, гэта мой сын!" Мяне адпусцілі…"*

Ракаўчане некалькі дзён спрабавалі дамагчыся праўды, збіраліся на плошчы Свабоды. Кожнага разу іх было не менш за дзве сотні, і людзі былі гатовы пісьмова пацвердзіць свой выбар. Ролю арганізатара подпісаў узяў на сябе Раман Гардзяюк: *"Да 18 жніўня ў мяне на руках ужо было 227 подпісаў. Мы афармілі паперы ў патрэбнай форме, і я асабіста адвёз іх у Валожын – заяву ў раённую пракуратуру і калектыўны зварот да старшыні Валожынскага райвыканкама* ***Яўгена Круковіча*** *з просьбай прыехаць у Ракаў і адказаць на пытанні жыхароў"* (у чыноўніка часу на сустрэчу так і не знайшлося).

Пракурору Валожынскага раёна Юрыю Канапацкаму ракаўчане ў заяве ад 18 жніўня паведамілі: *"Намі на выбарчым участку №19 зафіксавана істотнае разыходжанне колькасці галасоў, аддадзеных за кандыдата ў Прэзідэнты Ціханоўскую С.Г., – указаных у пратаколе камісіі (84 голасы) і пацверджаных подпісамі выбаршчыкаў (колькасцю 227, гл.дадатак на 9 лістах).*

Сыходзячы з сабранай заяўнікамі пры сумесным абмеркаванні інфармацыі, маюцца ўсе падставы лічыць, што на ўчастку быў здзейснены падлог дакументаў па выбарах, заведама няправільны падлік галасоў і фальсіфікацыя вынікаў галасавання…

Просім Вас правесці праверку па факце ўчыненага дзеяння, якое падпадае пад прыкметы злачынства, прадугледжанага арт.192 КК Рэспублікі Беларусь, і прыняць рашэнне ў адпаведнасці з арт.174 КПК; даць прававую ацэнку дзейнасці членаў участковай выбарчай камісіі №19 і прыцягнуць да адказнасці вінаватых у парушэнні заканадаўства асоб".

Тры дні падумаўшы, намеснік пракурора Валожынскага раёна **Яўген Маркевіч** пераслаў скаргу з Ракава на дзеянні выбарчай камісіі №19 у Цэнтральную выбарчую камісію. Маўляў, самі нашкодзілі (калі нашкодзілі) – самі і разбірайцеся. А ракаўчанам намеснік пракурора патлумачыў: *"У выпадку наяўнасці ў Вас канкрэтных звестак аб учыненым злачынстве Вы маеце права самастойна звярнуцца ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку ў органы папярэдняга следства па месцы здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў"*.

227 чалавек напісалі пракурору пра канкрэтны факт парушэння выбарчага заканадаўства, а ахоўнік права прыкінуўся сляпым, які не ўмее чытаць...

Раман Гардзяюк, атрымаўшы адпіску з пракуратуры, накіраваў запыт у Валожынскі РАУС з просьбай разгледзець парушэнні ў рамках артыкула 192 КК, які прадугледжвае канкрэтнае пакаранне за *"загадзя вядомы няправільны падлік галасоў ці іншае змяненне вынікаў галасавання або падлог дакументаў пры падрыхтоўцы і правядзенні мерапрыемстваў, накіраваных на рэалізацыю права свабоднага волевыяўлення грамадзян, здзейсненыя асобай, якая ўваходзіць у выбарчую камісію, ці службовымі асобамі дзяржаўных органаў…"*.

З РАУСа прыйшоў адказ, што артыкул 192 не ў іх кампетэнцыі. Раман і тут не здаўся: *"Я патэлефанаваў на гарачую лінію начальніку Валожынскага РАУСа* ***Дзмітрыю Вяроўчыку****, і ён мне параіў звярнуцца ў Следчы камітэт. Я звярнуўся туды, але і адтуль атрымаў несуцяшальную адпіску. Вось такое замкнутае кола: ты просіш іх пра адно, яны перакручваюць твой зварот на свой капыл і абтрасаюць рукі"*.

Найдаўжэй разважала над дасланай з Ракава заявай, падмацаванай 227 подпісамі, старшыня ЦВК **Лідзія Ярмошына** – амаль два месяцы. Урэшце ў Ракаў прыйшоў ліст і ад яе. Словы заслужанай юрысткі Рэспублікі Беларусь і ганаровай грамадзянкі горада Бабруйска, якая, відаць, набіла руку, адказваючы на падобныя звароты, можна лічыць вяршыняй казуістыкі: *"Тлумачым, што ў адпаведнасці з Выбарчым кодэксам Рэспублікі Беларусь устанаўленне вынікаў галасавання на ўчастках галасавання ажыццяўляецца ўчастковай камісіяй выключна на падставе спіса выбаршчыкаў і бюлетэняў, якія знаходзяцца ў скрынях для галасавання. Кодэксам не прадугледжаны такія крыніцы інфармацыі, як сабраныя па ініцыятыве кагосьці з грамадзян пасля выбараў подпісы.*

Акрамя таго, гарантый таго, што выбаршчыкі пры іх апытанні прыхільнікамі аднаго з кандыдатаў пацвердзілі свой сапраўдны выбар, не маецца. Само апытанне не адпавядае прынцыпам таемнага галасавання, устаноўленым выбарчым заканадаўствам. Такім чынам, праўдзівых дадзеных, якія паказвалі б на няправільны падлік галасоў на ўчастку для галасавання [№19], не маецца".

Што Лідзія Міхайлаўна клапатліва ўзяла пад крыло ракаўскі выбаркам, тут нічога дзіўнага няма – яны, што называецца, адным возам на піва ездзяць. Але хто даў ёй права абвінаваціць у хлусні як мінімум 143 законнапаслухмяных грамадзяніна (ад 227 мінусуем 84)? Вось ужо папраўдзе – валіць пані без сораму на любую старану. Толькі ці ёсць сэнс дашуквацца праўды ў чыноўніцы, якая заварыла такую кашу, якую вось ужо трэці месяц не можа расхлёбаць уся краіна?..

І ўсё ж Раман Гардзяюк спадзяецца, што позна ці рана вінаватыя ў ракаўскай фальсіфікацыі будуць названы і пакараны. *"У мяне ёсць цэлая картатэка парушэнняў, якія былі здзейснены службовымі асобамі падчас выбарчай кампаніі ў Ракаве і пасля яе – там 36 задакументаваных фактаў. Уся вярхушка валожынскай і ракаўскай улады брала ў гэтым удзел"*, – сцвярджае Раман.

Жыве Раман па суседстве са школай, якой кіруе тая самая Ганна Віктаровіч, якая кіравала выбаркамам на ўчастку №19. Ён неаднаразова спрабаваў з ёю сустрэцца і пагаварыць, але дырэктарка адразу пасля выбараў сыходзіла ў адпачынак і знікала з Ракава, а нядаўна нібыта падхапіла каранавірус. *"У маіх вачах гэты настаўнік перастаў быць паважаным"*, – з сумам падводзіць рысу пад нашай гутаркай Раман Гардзяюк.

На развітанне цікаўлюся, ці не прыязджала аўтавышка здымаць сцяг з яго дома. Вышка не прыязджала, заяўляўся ўчастковы Аляксандр Кажэка. Але не на таго нарваўся. Праграміст па прафесіі, Раман за два апошнія месяцы няблага вывучыў законы і цытуе артыкул за артыкулам, як рэпу грызе. Участковаму таксама быў працытаваны адпаведны закон аб прыватнай уласнасці, і ён сышоў як мыла з'еўшы.

Трое жыхароў Ракава ў жніўні былі асуджаны па самым папулярным на сённяшні дзень у беларускіх судах артыкуле 23.34 – удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве. У тым ліку маладзіца Алена (імя выдуманае, сапраўднае вядома рэдакцыі). Яна працуе ў дзяржаўнай установе, таму пагаварыць "на дыктафон" згаджаецца толькі на ўмовах ананімнасці.

"Ведаеце, я сама магу палічыць хаты, у якіх галасавалі за Ціханоўскую. Ды і незалежныя назіральнікі, якіх, праўда, на выбарчы ўчастак не дапусцілі, усё ж на ганку лічылі людзей з белымі стужачкамі, рабілі апытанне. Лічбы і блізка не супадалі. Мы звярталіся ў сельсавет, ксёндз Дзмітрый напісаў ліст (быў у гэты час за мяжой), бацюшка Сергій на сустрэчу людзей на плошчы прыходзіў. Усе не засталіся абыякавымі да таго, што адбылося. Сабраліся, пагаварылі, але ніякага станоўчага выніку ад мясцовай улады не дамагліся.

"Вынікам" асабіста для мяне стаўся суд у Валожыне. А перад гэтым у мяне наш участковы Кажэка ўзяў тлумачэнні. Так, я прыходзіла на плошчу, я не адмаўлялася, але што ў тым супрацьзаконнага? Я маю права прайсціся з людзьмі. Мы хацелі пагаварыць са старшынёй сельвыканкама. Што гэта робіцца ў нашай краіне – туды не хадзі, там не стой!.. Канешне, у пададзенай у суд паперы было сказана пра мой удзел у несанкцыянаваным мітынгу. А я наш сход, які, дарэчы, ніхто не арганізоўваў, не лічу мітынгам. Мітынг, я так разумею, мае нейкі сцэнар, павінны быць выступоўцы. А ў нас людзі проста прыйшлі, паміж сабой ціха пагаварылі. Які ж гэта мітынг? Мы праспявалі, праўда, "Магутны Божа" – сабраліся людзі з трох ракаўскіх хораў: каталікі, праваслаўныя і пратэстанты.

У выніку мне прысудзілі тры базавыя. На суд я не ездзіла – навошта? Ведала, што абавязкова асудзяць. Так, атрымліваецца, я прызнала віну. Вінаватая, але не каюся! Па Канстытуцыі я маю права на мірныя сходы. Але хто сёння на тую Канстытуцыю зважае? Пагоня ў нас таксама не забаронена і нават пад аховай дзяржавы, аднак паспрабуй з ёю прайдзіся! Такі буралом у краіне ўсчаўся – хоць у склеп які хавайся. Столькі няпраўды з афіцыйных СМІ штодня выплюхваецца! Каб ведаць праўду, хоць сваю, ракаўскую, мы завялі свой тэлеграм-канал", – як суцяшэнне паведамляе мне спадарыня Алена.

Прачытаўшы гэту гісторыю, магчыма, хтосьці пазайздросціць ракаўчанам: ніхто з іх нават на суткі не загрымеў, усё абышлося трыма штрафамі. І прыгадае, як у вёсцы Лебедзева на Маладзечаншчыне на людзей, якія разам са сваім мясцовым дэпутатам пасля 9 жніўня неслі заяву ў сельсавет, наляцелі амапаўцы і проста пасярод ходнікаў паклалі ўсіх тварам у зямлю (і дэпутата таксама).

Так, на фоне забойстваў і выкрадання людзей на вуліцах, пасля катаванняў у аўтазаках і вязніцах, пасля масавых драматычных звальненняў па палітычных матывах у недалёкім Мінску "гыргыргарадок" Ракаў сапраўды выглядае зацішным кутком. Але зацішак гэты да пары да часу.

Ракаўчане ўпэўнены: не цяпер, дык ў чацвер вяршэнства закона будзе адноўлена, і тыя, хто растаптаў іх свабоду выбару на плошчы Свабоды, атрымаюць прававую ацэнку сваёй дзейнасці. А пакуль тое станецца, агрэсіўныя генералы, якія сабраліся ваяваць з уласным народам, у чым не саромеюцца прызнацца з тэлеэкрана, павінны памятаць пра "беларускія аўтаматы", якіх у кожнага добрага гаспадара па некалькі штук на падворку знойдзецца…

Антон ЗАГОРСКІ.

ПОДСЧИТАЛИ

Госдолг растет…

Государственный долг Беларуси на 1 октября 2020 года составил 56,9 млрд рублей, увеличившись по сравнению с началом года на 12,1 млрд рублей, или на 27%, сообщает Минфин.

Золотовалютные резервы Беларуси только за август и сентябрь снизились на 1,535 миллиарда долларов, или на 17,6%.

ШЛАГБАУМ

Въезд запрещен!

Беларусь временно запретила въезд иностранным гражданам и лицам без гражданства.

Как сообщает Госпогранкомитет, ограничение вводится в связи с карантинными мерами по коронавирусу. Оно будет действовать на всех погранпереходах, за исключением Национального аэропорта Минск.

КАДРЫ

Экс-министр ЖКХ нашел новую работу

Александр Терехов назначен гендиректором государственного производственного объединения «Минскстрой». Александр Терехов был министром ЖКХ с 2004-го по 2020 год.

«Минскстрой» координирует работу около 20 строительных предприятий столицы и выступает самостоятельным заказчиком строительства. До начала октября 2020 года его возглавлял **Игорь Скопцов**, но он покинул пост по соглашению сторон.

ФИНАНСЫ

«Приорбанк» платит за новичков

«Приорбанк» ввел систему вознаграждений за привлечение новых клиентов – индивидуальных предпринимателей и юридических лиц. Партнером может стать любой человек, а за каждую рекомендацию можно получить до 150 рублей.

Как сообщает пресс-служба банка, чтобы стать партнером, нужно заключить договор. Дальше требуется лишь рекомендация: все переговоры, выбор пакета и оформление счета берут на себя специалисты банка.

Величина вознаграждения зависит от формы собственности привлекаемых клиентов и их количества в месяц. Так, при привлечении одного ИП в месяц выплачивается 40 рублей, а юридического лица – 80. Каждая успешная рекомендация двум и более клиентам в месяц поощряется 50 рублями за каждого ИП или 150 – за каждую организацию. Деньги перечисляются на счет партнера по результатам месяца.

Галина РУТ.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ



Ці спадабалася б Купалу, каб ён наведаў тую залу?

Як вядома, некалькі дзясяткаў артыстаў Купалаўскага тэатра звольніліся ў знак пратэсту, таму многія калектывы, падтрымліваючы калег, лічаць недапушчальным выступаць на гэтай сцэне. Аднак знаходзяцца і штрэйкбрэхеры. Нядаўна ў паўпустой зале выступіў ансамбль “Харошкі”, а затым і Дзяржаўны аркестр пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга (у зале было каля дзясятка слухачоў). Тым не менш у інтэрв’ю TUT.BY М.Фінберг адзначыў, што “канцэрт прайшоў на надзвычай высокім узроўні”…

Хоць выраз той – не адкрыццё,
Ды колісь прагучаў цікава:
“Жыццё – тэатр”.
“Тэатр – жыццё,” –
Такая ў нас на сёння ява.
Акцёры, поўныя надзей,
"Нейкае дзіўнае стала наведваць пачуццё... – *прызналася артыстка, якая пару тыдняў таму з'ехала з Беларусі ў Парыж.* – Пачуццё згубленасці. І галоўнае пытанне: калі гэта ўсё скончыцца?

Да гэтага ў галаве і ў штодзённіку заўсёды было ўсё па палічках: я ведала, што ў мяне наперадзе на паўгода наперад! Зараз жа спектаклі на лістапад адмяняюцца, пераносяцца, і незразумела ўжо, ці адбудуцца яны ўвогуле.

Гарады закрыты для правядзення мерапрыемстваў.

Магчыма, нехта скажа, што не час зараз для весялосці і забаў. Але з іншага боку: чаму нельга? Прыняты максімальныя меры для абмежавання кантактаў. Тады чаму ўсе работнікі, настаўнікі, гандляры і г.д. праводзяць дні ў ахоўнай масцы, а ў тэатры нельга ў такой самай масцы пасядзець 1,5 гадзіны?

Я не мітынгую і ні да чаго не заклікаю, проста спрабую зразумець. Бо я зараз кажу не толькі пра акцёраў, спевакоў, танцораў, якія не могуць выйсці на работу. Гэта велізарная колькасць людзей: пастановачныя групы, адміністратары.

Сумна за маіх знаёмых хлопцаў...

Я, вядома, з задавальненнем праводжу гэтыя дні з дзіцем, але... Што далей?

Сумую па сцэне.

Тры з паловай тыдні я была ў Беларусі. Моя мама трапіла ў шпіталь з COVID-19 (параза лёгкіх 50 працэнтаў).

У гэты ж час паміраe мамчын хросніk (проста лёг спаць і не прачнуўся), у пляменніцы выразаюць апендыцыт, а ў сястры, якая прыляцела спецыяльна з Нью-Ёрка з-за мамы, раптам знаходзяць пнеўманію, якую, на шчасце, потым не пацвердзілі...

Але ўсё вярнулася на кругі свае. Мама цяпер адчувае сябе добра. Мы вярнуліся ў Парыж *(актрыса замужам за французам. – Рэд.)*, каб праз некалькі дзён трапіць на ўсеагульны каранцін...

Увогуле, як сказала б я з беларускім акцэнтам: «Дурдом і трошкі...»

Але... Жыццё працягваецца, нягледзячы ні на што!»

Галіна РУТ.

Народная Воля http://www.nv-online.info 3 ЛІСТАПАДА 2020 г.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Репрессии не стимулируют к научному поиску

*Старший научный сотрудник центра «Фундаментальные взаимодействия и астрофизика» Института физики НАН Беларуси, кандидат физико-математических наук **Иван Сивцов** до недавнего времени считал себя человеком достаточно аполитичным. Но сегодня он в числе тех ученых, которые не могут и не хотят мириться с происходящим в стране. Что побуждает не молчать? Как нынешняя ситуация отражается на работе ученых? Что вызывает у него разочарование, а что внушает оптимизм? Об этом «Народная Воля» и попросила высказаться талантливого ученого.*



Это невозможно терпеть

– В свое время у меня была возможность остаться в Италии или Бразилии, но я сознательно вернулся в Беларусь, *– говорит Иван Сивцов.* – Люблю свою страну, у меня здесь семья, друзья, знакомые. И я хотел бы развивать астрофизику на родине.

Но когда слышишь заявления «если хочешь быть ученым в Беларуси, нужно поддерживать действующую власть», возникает внутренний протест. Потому что в нынешней репрессивной обстановке, когда рты затыкаются дубинками, продуктивность любого труда, а тем более творческого, научного, заметно снижается. А главное – жить становится душно, страшно, неинтересно.

От некоторых коллег слышишь: «наука должна быть вне политики». Но то, что сегодня творится в стране, – это не политика. Это борьба добра и зла, света и тьмы, достоинства и цинизма, гуманизма и бесчеловечности.

Невозможно терпеть ситуацию, когда против мирно протестующих возбуждены сотни уголовных дел, а за убийство Александра Тарайковского до сих пор не возбуждено, как и за проявленные по отношению к тысячам граждан насилие, пытки, беспредел силовиков. Сегодня граждан наказывают за высказывание своего мнения, а силовики остаются безнаказанными за то, что калечат людей, подрывают им здоровье, психику. Они дошли до того, что не выполняют даже собственные принятые правила, бьют дубинками по головам, нанося черепно-мозговые травмы.

Государство – это наемные менеджеры, которых народ выбирает для управления. Если они не справляются со своими функциями, то их перевыбирают. А у нас отняли это право. И сегодня мы наблюдаем полное игнорирование всего, что написано в Конституции, не выполняются базовые обязательства. Государство ведет себя как бандит.

Понятно, что люди не хотят мириться с этим и требуют новых честных выборов, освобождения политзаключенных, остановки беззакония и насилия на наших улицах. Белорусы устали от наглого циничного вранья.

Лукашенко продвигает сегодня идею конституционной реформы. Но она будет рассматриваться на Всебелорусском собрании. Оно формируется из трудовых коллективов. А он же сам заявил, что всех протестующих оттуда нужно уволить. Получается – к выработке новой Конституции никого с альтернативным мнением не допустят. И это называется национальным диалогом?

Еще 5 лет без изменений – и от науки мало что останется

– Да, среди ученых есть убежденные сторонники Лукашенко, но они в подавляющем меньшинстве. Гораздо больше тех, кто против насилия, у кого происходящее в стране вызывает откровенный протест, но они не решаются и не проявляют активно свою позицию, считая это бесполезным либо из-за страха. Силовики 3 месяца «работают» над тем, чтобы запугать людей.

Но все больше тех, кто уже устал бояться.

У меня есть семья, дети. И я, безусловно, понимаю, что за высказывание своей позиции сегодня могут уволить. Поскольку по политическим мотивам наш закон увольнять запрещает, а научные результаты у меня высокие, то, конечно, в этом случае прикроются чем-то другим. Но уволят – значит, придется искать, где реализовывать свои знания за пределами НАН Беларуси, а при наихудшем сценарии – за пределами страны. Эмиграция – крайняя мера. Но если репрессии не прекратятся, то в конце концов ничего другого не останется.

Хочу верить, что возобладает разум, понимание того, кто для науки более ценен – молчаливый безынициативный соглашатель или человек с активной гражданской позицией, со своим мнением, которое он готов отстаивать в диалоге. Увольнение профессионалов, влюбленных в свое дело, только усугубит и без того непростую ситуацию в нашей науке.

Пока еще у нас есть сильные специалисты пенсионного возраста и перспективная молодежь. Но среднее поколение ученых представлено слабо. И если 30–40-летние покинут страну, то у кого будет учиться молодежь? Разумеется, она тоже постарается уехать из Беларуси. Пока у отечественной науки еще есть шанс. Но еще лет 5 без изменений – и от нее ничего не останется.

О самом большом разочаровании и о том, что внушает оптимизм

– Самое большое мое разочарование в том, что в августе удалось задавить протесты и забастовки рабочих на предприятиях.

А источник оптимизма в том, что каждые выходные люди выходят на протесты. Никто не мог предположить, что они будут длиться так долго.

У меня нет сомнений, что система не выдержит, потому что она себя изжила. Но вопрос, сколько времени на это потребуется и какова будет цена для страны и граждан. Чем дольше продержится диктатура, тем к большему обнищанию это приведет.

“Любимую не отдают»? Ее насилуют и бьют, прикрываясь словами о том, что это для ее же блага… Я считаю иначе. Когда любишь, отпускаешь, даешь свободно дышать и быть счастливой.

Илона ВОСКРЕСЕНСКАЯ.

Фото агентства “Минск-новости”.

САЛІДАРНАСЦЬ

Віталь РЫМАШЭЎСКІ: «Дапамагаем Паўлу і яго сям'і чым можам…»

***Павел СЕВЯРЫНЕЦ** – вядомы актывіст хрысціянска-дэмакратычнага руху ў Беларусі. Вось ужо каля пяці месяцаў ён знаходзіцца за кратамі.*

“Народная Воля” пацікавілася ў аднаго з яго аднадумцаў **Віталя РЫМАШЭЎСКАГА**, як сябры Паўла па стварэнні партыі БХД падтрымліваюць яго ў гэты надзвычай цяжкі час.

– Скажыце, якія сувязі ў вас зараз існуюць з палітзняволеным?

– Усе сувязі – праз адваката і сям'ю. Тое, што Павел піша жонцы, яна затым перадае нам. Бо, напрыклад, мае лісты да яго не даходзяць, і ад яго таксама няма карэспандэнцый. Калі ў лісце маецца нейкая інфармацыя, якая тычыцца нашых партыйных спраў, то яго цэнзура не прапускае.

Але мы дапамагаем Паўлу чым можам. Сярод еўрадэпутатаў знайшлі апекуна Севярынца, таму пытанне яго вызвалення, а таксама вызвалення астатніх беларускіх палітвязняў і ў Еўрапарламенце, і сярод заходніх палітыкаў пастаянна на слыху. Еўрадэпутаты запісваюць відэазвароты ў падтрымку беларускіх палітвязняў, гэта таксама дае плён. Трэба разумець, што сёння самы вялікі эфект па вызваленні палітвязняў дае міжнародны ціск. Той жа Віталь Шкляраў адразу ж выйшаў на волю пасля таго, як у справу ўмяшалася вышэйшае кіраўніцтва ЗША.

Рабілі ўсё магчымае і дзеля таго, каб Павел Севярынец стаў лаўрэатам прэміі Сахарава, але, на жаль, у канчатковым спісе яго не аказалася. Старая беларуская апазіцыйная супольнасць, відаць, успомніла нейкія былыя спрэчкі і сваркі.

Але, паўтаруся, на міжнародным узроўні праводзім шмат работы ў плане вызвалення Паўла Севярынца і не толькі яго. Увогуле, з беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў сёння за кратамі знаходзяцца Павел і Тацціяна Канеўская. Мы, безумоўна, турбуемся іх лёсам, вырашаем пытанні з юрыдычнай падтрымкай і ўсё астатняе. Гэта ўсё вісіць на нас. Калі знаходзім сродкі, то пэўныя выдаткі кампенсуем.

– У апошнія месяцы не было чуваць, каб актывісты БХД арганізоўвалі пікеты з патрабаваннямі да ўлад вызваліць Севярынца з-за кратаў…

– Нашы актывісты і так удзельнічаюць ва ўсіх акцыях пратэсту, якія праходзяць і ў Мінску, і ў рэгіёнах, таму не бачу вялікай неабходнасці, каб падаваць заяўкі на новыя пікеты. Тым больш што зараз пікеты і маршы ніхто не замаўляе.

Навошта прасіць дазвол на правядзенне нейкай асобнай акцыі? На ўсіх маршах, у якіх мы бяром удзел, гучаць патрабаванні вызвалення палітвязняў. У тым ліку і Паўла Севярынца.

– А чаму за ўвесь час, што Павел знаходзіцца ў ізалятары, не было праведзена ніводнага мітынгу? Скажам, дазвол улад на то, каб ён адбыўся на плошчы Багалор, можна было б атрымаць…

– Паўтаруся: у сённяшніх варунках асобная акцыя на плошчы Бангалор з дазволу ці без даволу будзе выглядаць, мякка кажучы, дзіўна. Мне здаецца, што пасля выбараў не было ў Мінску ніводнай ініцыятывы, каб нехта звяртаўся ў Мінгарвыканкам па дазвол на правядзенне акцыі. У тым ліку і таму, што няма ніякага сэнсу ў такіх зваротах.

Мы нека звярталіся да гарадскіх улад з ініцыятвай правесці вялікі мітынг у дазволеных месцах, але нам забаранілі. А зараз улады дзейнічаюць яшчэ больш жорстка. Таму, натуральна, ніхто нам мітынг не дазволіць.

– Можа быць, ёсць нейкі план супольных дзеянняў па вызваленні Севярынца з іншымі дэмакратычнымі партыямі Беларусі?

– Беларуская хрысціянская дэмакраты падтрымліваюць і ўваходзяць у Каардынацыйную раду дэмакратычных сіл, таму што зараз – час яднання.

Таму калі мы кажам пра вызваленне Паўла, то гэта гучыць у кантэксце той працы, якая ідзе па вызваленні ўсіх палітычных зняволеных. Кампанія вызвалення палітвязняў ідзе агулам, а не па канкрэтных асобах, хаця Павел Севярынец – адзін з лідараў дэмакратычных сіл. Мы апякуемся нашымі паплечнікамі асабліва, але ў той жа момант не падзяляем тых, хто знаходзіцца за кратамі па палітычных матывах, на сваіх і чужых.

– А якую падтрымку мае сям'я Паўла ад яго паплечнікаў па стварэнні партыі “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”?

– Збіраем для сям'і тое, што можам. Сродкі, можа быць, і не вельмі вялікія, але, калі ёсць магчымасць, то стараемся падтрымаць жонку Паўла і яго сына Францішка.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

«ЛІСТАПАД»

Без «Купалы», без зорак, без прэзідэнцкага прыза

У пятніцу 6 лістапада адкрыецца 27-ы Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». Урачыстай цырымоніі не будзе, міністр культуры наўрад ці наведае гэтае мерапрыемства. Дырэктар фестывалю **Анжаліка Крашэўская** проста скажа слова ў рабочым парадку. Гледачы ў кінатэатры “Масква” будуць сядзець у шахматным парадку. Не будзе і ўсмешак на тварах – іх проста наглуха схаваюць маскі.

Чым яшчэ, акрамя пандэміі, запомніцца нам гэта адкрыццё? Не будзе ўручаны прыз ад прэзідэнта «За гуманізм і духоўнасць у кіно». У сувязі з вострым палітычным крызісам, калі гуманізм і духоўнасць штодня груба парушаюцца ў рэальным жыцці, было б насмешкай прамаўляць гэтыя словы ў звязку з імем Аляксандра Лукашэнкі.

Не пакажуць на адкрыцці і доўгачаканы фільм «Купала» рэжысёра У.Янкоўскага. Кінастудыя «Беларусьфільм» не пакідае надзеі на ўдзел стужкі ў замежных кінафорумах, а значыць, з прэм'ерай на радзіме зноў давядзецца пачакаць. Надзейныя афіцыйныя крыніцы паведамілі, што кінастужку павязуць на малавядомы кінафестываль «Маскоўская прэм'ера», які толькі ў мінулым годзе стаў міжнародным. Але і пасля яго, думаю, мы яшчэ доўга не ўбачым гэтае кіно на вялікім беларускім экране. Чаму – тлумачыць нікому не трэба. Адно толькі імя Купалы прымусіць цяпер любы зал ўзняцца і разгарнуць бел-чырвона-белыя сцягі перад сеансам. І начальства будзе біцца ў канвульсіях страху.

Не прыедуць у Мінск на «Лістапад» і любімыя зоркі кіно. Усе на каранціне. І нават міжнародныя журы будзе працаваць анлайн. Але што ж тады ёсць у безумоўным плюсе? Добрае кіно: 120 фільмаў з 50 краін, якія будуць дэманстравацца ў кінатэатрах сталіцы цэлы тыдзень, аж да 13 лістапада. І нават з начнымі паказамі, якія так папулярныя ў маладых.

На адкрыцці пакажуць фільм Вадзіма Перэльмана «Урокі фарсі». Прэм'ера гэтай стужкі сумеснай вытворчасці Расіі, Германіі і Беларусі адбылася на апошнім Берлінскім кінафестывалі і была ўганаравана дзесяціхвілінай авацыяй. Расійскае сучаснае кіно будзе прадстаўлена фільмам Івана Цвярдоўскага «Канферэнцыя» пра падзеі 2002 года, калі чачэнскія баевікі захапілі гледачоў у тэатральным цэнтры на Дуброўцы. У асноўным конкурсе возьме ўдзел і літоўская кінастужка «У прыцемках» рэжысёра Шарунаса Бартаса. Карціна была адабрана на Канскі кінафестываль 2020 года.

У Нацыянальным конкурсе возьмуць удзел дакументальныя карціны «Мне трэба поціскаў ...» Андрэя Куцілы, «Эпітафія» Віктара Аслюка, «Цемра звонку» Анастасіі Мірашнічэнка, «Невядомы рай» Дар'і Юркевіч, моцных беларускіх дакументалістаў, чые працы прызнаны на міжнароднай кінаарэне. Сярод поўнаметражных ігравых беларускіх прэм'ер – фільм Мітрыя Сямёнава-Алейнікава «Забароненая зона» і аўтабіяграфічны хорар Мікіты Лаўрэцкага «Мікіта Лаўрэцкі».

Алена МАЛОЧКА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Марыя ТУЛЬЖАНКОВА: «Людзям не патрэбны арганізатар, каб выказаць пратэст супраць відавочнага беззаконня»

Пасля 15 сутак адміністрацыйнага арышту гомельская мастачка і дызайнерка Марыя Тульжанкова выйшла на волю. З ёй пагутарыў журналіст «Народнай Волі».

– Пятнаццаць сутак мне адмераў суд, а яшчэ двое я сядзела ў ізалятары да суда. Набралася агулам сямнаццаць. На дадзены момант я падазраваная ў крымінальнай справе аб арганізацыі масавых беспарадкаў – паводле ч.1 арт.342 Крымінальнага кодэкса. Копію пратакола мне не выдалі, затое ўзялі ў мяне падпіску аб нявыездзе. Наколькі разумею, у гэтай так званай справе трое падазраваных. Мяркую гэта па колькасці канфіскаваных носьбітаў інфармацыі, якія накіраваны на экспертызу.

– Суткі вы адбывалі за ўдзел у недазволеным шэсці 30 жніўня. А ў чым вас зараз следчыя падазраюць – нібыта ў вывадзе на гомельскія вуліцы на пратэстныя маршы 10 тысяч гараджан? Кшталту: галёкнулі ці махнулі чароўнай палачкай – і гараджане выйшлі пратэставаць?

– Інфармацыя, што мной цікавіцца КДБ, паступала да мяне з розных крыніц яшчэ раней. На іх разуменне, я сапраўды выглядаю надзвычай падазрона, бо часцяком езджу ў Польшчу, не працую. Амаль нідзе не “свяцілася” на пратэстах. Відаць, перахапілі маю размову пра тое, што хачу адкрыць галерэю альтэрнатыўнага мастацтва і дапамагаць ахвярам рэпрэсій у Гомелі. Успомнілі яшчэ, што хтосьці робіць на акцыях запамінальныя постары. Ну канешне мастачка! Тое, што я вучылася ў Польшчы і толькі напрыканцы верасня абараніла магістарскі дыплом, гэта, мусіць, па-за межамі іх разумення. Як і тое, што людзям не патрэбны ніякі арганізатар, каб выказаць незадаволенасць і пратэст супраць відавочнага беззаконня.

Бачаць толькі нейкую канспіралогію, якую часам агучвае супрацоўніца Следчага камітэта. У пратаколах пазначана, што маюцца нейкія звесткі, якія дазваляюць лічыць мяне датычнай да арганізацыі масавых беспарадкаў. Атрымліваецца следчы працэс наадварот: спачатку абвінавачанне, а потым ужо шукаюць хоць якія доказы.

У ізалятары я падала скаргу на следчага. Хачу высветліць, на якой падставе ў мяне дома зроблены вобшук, праводзілася экспертыза камп'ютара, тэлефона і ў якім я статусе. Але следчы, які пачынаў справу, яе ўжо не вядзе. Мабыць, неўзабаве перададуць справу камусьці іншаму.

– Нейкія “звесткі”, відаць, шукалі ў вашых камп'ютары і тэлефоне?

– Дагэтуль шукаюць. З ізалятара мяне вывезлі раней тэрміну, адвезлі ў Следчы камітэт. Вярнулі ноўтбук, які забралі падчас ператрусу. Папярэдзілі, што гэта рэчавы доказ і я не маю права яго знішчаць. Праверка сістэмы паказала наяўнасць у ноўтбуку шматфункцыянальнай шпіёнскай праграмы, у яе дзве незалежныя часткі: адміністратарская і схаваная. Нават крыху крыўдна, што трымаюць мяне за ідыётку. А тэлефон забралі. Наколькі разумею,



шукаюць заснавальнікаў чатаў, каб пераняць правы ўладальнікаў. Узламалі паролі і выйшлі з майго акаўнта ў телеграм. Будуць высвятляць, ці заклікала я хоць кагосьці выходзіць на пратэстныя маршы.

– Марыя, калі не памыляюся, вы да цяперашняй “пасадкі” ў ізалятар ужо мелі досвед знаёмства з гэтай установай. Калі не блытаю, за распаўсюджванне ўлётак. Камітэт ААН па правах чалавека прызнаў той ваш арышт незаконным. Гэтым разам за вас заступалася польская Акадэмія мастацтваў – рэктарат і студэнты выказвалі абурэнне з тае прычыны, што выпускнікі беспадстаўна пакутуюць у Беларусі, заклікалі ўлады да захавання міжнароднага гуманітарнага права. Пэўна ж, і лісты ад сяброў прыходзілі. Вас гэта падтрымлівала, надавала моцы, раўнавагі?

– Дзякуй усім беларусам, знаёмым і незнаёмым, за шматлікія лісты і падтрымку. Сардэчная падзяка сябрам і калегам з Вроцлава і Шчэціна. Да мяне даходзілі некаторыя навіны, і гэта акрыляла і надавала пазітыву. Лепей, канечне, не мець такога досведу, але і баяцца патрапіць за краты не трэба. Ведаеце, часам я лавіла сябе на думцы, што падчас этнаграфічных экспедыцый жыла і ў горшых умовах. Гомельскі ІЧУ крыху апграйдзіўся ў параўнанні з тым, што было дзясятак гадоў таму. Умовы цярпімыя, але і багата парушэнняў. Таму дбайце пра сябе самі: патрабуйце “хуткую”, калі вам блага ці ёсць пабоі. Фельчар адмаўляецца гэта рабіць, пішыце скаргу начальніку. Вы маеце права на пасцельную бялізну, прагулкі, душ, сродкі асабістай гігіены. Апошняя ізалятару выдзяляе ў якасці дапамогі таварыства Чырвонага Крыжа, сродкаў гігіены хапае – імі хоць грэблю масці. Належыць арыштанту і кіпень, што б там ні казалі. На паверсе ёсць бойлер з цёплай вадой. Калі патрэбна вада, асабліва жанчынам, прасіце “прадольных” набраць яе ў пластыкавую бутэльку. Калі нехта курыць, парайце, каб дымілі ў акно альбо кажыце на ранішніх абходах пра алергію на цыгарэтны дым. Афіцыйна курыць у камерах нельга. Вокны можна зачыняць нанач – у “прадольных” ёсць ключ.

Асабіста мяне ўсе 17 дзён ратавала іронія. Настройцеся на пазітыў. У ізалятары ваш адносны камфорт у вялікай ступені залежыць ад настрою ахоўнікаў, жарты яны таксама разумеюць. Я нярэдка заводзіла гутаркі з “прадольнымі”. Яны не баяцца, як агню, баяцца найперш агалоскі. Цікава было часам даведацца, на якім свеце яны жывуць.

Часам мы рабілі дзеля смеху дробныя бел-чырвона-белыя авантуры: ручнікі такіх колераў вывешвалі, надпісы “Жыве Беларусь!”, “кармушку” клеілі. Хлопцы з хлебнага мякішу “Сашу 3%” ляпілі. На нашым паверсе ўсе стукалі ў дзверы адмысловым чынам: два доўгія і тры кароткія стукі. Як азбука Морзэ. Пазней і “прадольныя”, здаецца, сталі падыгрываць. Такія дробязі ўзнімаюць настрой. І ганарыцца сабой – мы і праўда неверагодная нацыя!

Гутарыў Анатоль ГАТОЎЧЫЦ.

ВНЕ ИГРЫ

Страсти вокруг коронавируса

Необычное продолжение получил матч группового этапа Лиги чемпионов по гандболу между белорусским клубом «Мешков Брест» и венгерским «Пиком», в котором победу праздновала наша команда.



После игры венгерский клуб выступил с претензиями к белорусам.

«За три дня до матча в клубе из Бреста у одного игрока был выявлен положительный тест на COVID-19, – говорится в заявлении «Пика». – *Нам сообщили об этом беспрецедентным и неприемлемым образом – за сутки до игры во время тренировки по электронной почте. «Пик» немедленно связался с ЕГФ для оценки ситуации и указал, что в этом случае рискованно проводить матч.*

Брестчане прошли тестирование в день игры. В это время один из вратарей клуба уже был с симптомами коронавируса и находился дома. Мы снова сигнализировали ЕГФ, что существует высокий риск заражения наших игроков и это ставит под угрозу следующую игру с «Фленсбургом». За два часа до начала встречи нам пришло официальное уведомление, что у хозяев все тесты отрицательные и игра не будет отменена.

Вернувшись домой, прошли тестирование и выяснилось, что еще три гандболиста «Пика» заразились коронавирусом».

«Мешков Брест» не остался в стороне и ответил на заявление «Пика»: *«Перед матчем клуб провел тестирование игроков и уведомил ЕГФ и команду соперника о его результатах. В том числе о четырех положительных тестах.*

Сразу же после получения результатов тестирования мы изолировали инфицированных гандболистов, не имевших никаких симптомов простуды, а также голкипера Ивана Мацкевича, у которого поднялась температура, но результат теста был отрицательный.

Клуб не настаивал на проведении поединка и был готов принять любое решение ЕГФ, в том числе отмену игры. Однако результаты тестов всех гандболистов, попавших в заявку, и повторный тест Мацкевича оказались отрицательными – и ЕГФ приняла решение проводить матч.

Мы искренне сожалеем о случаях инфицирования в составе венгерского клуба и желаем здоровья игрокам «Пика» и всем участникам Лиги чемпионов».

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

З НАГОДЫ

З кім вы, таварыш Кавальчук?

Міністэрства спорту і турызму працягвае рэпрэсаваць спартсменаў за іх погляды і выказванні, не зважаючы ні на тытулы, ні на званні.

Пазбавілі прэзідэнцкай стыпендыі славутага трэнера фрыстайлістаў **Мікалая Казеку**. Звольнілі з нацыянальнай каманды "за прагулы" чэмпіёнку свету **Аляксандру Раманоўскую**. Камандзіравалі ў вайсковую часць сярэбранага прызёра Алімпіяды **Андрэя Краўчанку**, і той вымушаны быў адмовіцца ад такой прапановы.

Днямі стала вядома, што дзюдаісты **Дзмітрый Шэршань** і **Аляксандр Вахавяк**, якія дасягнулі вялікіх поспехаў на міжнароднай арэне, таксама адлічаны са зборнай і "па настойлівай рэкамендацыі Мінспорту" звольнены з месца праходжання службы.

Дзмітрый Шэршань двойчы станавіўся прызёрам чэмпіянатаў Еўропы, у 2016 годзе прадстаўляў Беларусь на Алімпійскіх гульнях у Рыа. Аляксандр Вахавяк – прызёр Кубка Еўропы і шэрагу турніраў серыі Гран-пры.

Абодва рыхтаваліся да Алімпійскіх гульняў у Токіа, але "няправільная палітычная арыентацыя", відаць, перакрэсліла гэтыя планы.

Зрэшты, іншага і чакаць было не варта ад ведамства, якое ўзначальвае не шматразовы алімпійскі чэмпіён ці хаця б вядомы ў спартыўных колах чалавек, а былы супрацоўнік Службы бяспекі прэзідэнта **Сяргей Кавальчук**. Чалавек, які прызвычаіўся найперш выконваць і аддаваць каманды, а ўжо затым думаць пра тое, якія з-за гэтага будуць наступствы і для твайго ведамства, і для беларускага спорту ў цэлым.

Сёння для гэтых чыноўнікаў вальнадумства спартсменаў куды больш небяспечнае, чым адлуп начальства за недабор медалёў. Але ж і начальства з той жа оперы – Нацыянальным алімпійскім камітэтам, як вядома, кіруе Аляксандр Лукашэнка.

Таму ўсіх, хто адкрыта выказаў сваю грамадзянскую пазіцыю, хто выступіў супраць беззаконня, фальсіфікацый і гвалту, вырашылі, як кажа адзін дзеяч, "загнаць пад плінтус".

Тытулаваная баскетбалістка **Алена Леўчанка**, якая адсядзела 15 сутак за ўдзел у мірным маршы, распавядала жахі, якія ёй давялося перажыць у ізалятары. І ўчынілі гэтыя жахі для спартсменкі і ўсіх тых, хто быў разам з ёй у камеры, відаць, спецыяльна, каб паказаць, што для іх няма аўтарытэтаў.

"Забралі матрацы, адключылі гарачую ваду, каналізацыю і падсялілі двух чалавек – у камеры на чатырох чалавек нас стала пяцёра, – распавядала Алена. – *Не разумелі, як спаць. Сцялілі газеты і вопратку. Я, як самая высокая, спала на лаўцы, нехта – на стале. Хтосьці ўдвух – было вельмі холадна, батарэі не грэлі".*

Той самы міністр Сяргей Кавальчук, які любіць паганяць шары ў більярд, павінен быў першым бегчы з кіем на Акрэсціна і вызваляць спартсменку, якая столькі зрабіла для беларускага спорту і краіны, што некаторым і не снілася (і наўрад ці яны за ўсё жыццё зробяць дзясятую частку таго, што ўжо зрабіла Лена).

Спартыўны міністр павінен быў на ўсіх судовых працэсах абараняць сваіх спартсменаў, стаяць за іх гарой, бо гэта – яго падначаленыя.

Адзін былы кіраўнік галоўнага спартыўнага ведамства краіны неяк шчыра мне прызнаўся, што ўсе спартсмены для яго – як дзеці. У кожнага свой характар, але ўсіх ён быў гатовы выслухаць, зразумець і па магчымасці дапамагчы.

Сёння гэтых самых спартсменаў, злычынства якіх заключаецца толькі ў тым, што яны выступаюць за справядлівасць, не толькі не ратуюць, але і тым самым кіем яшчэ адштурхоўваюць ад берага.

"Вас дзяржава ўсім забяспечвала, грошы плаціла, – прыводзяць аргументы спартыўныя чыноўнікі. – *За гэта трэба было маўчаць і не лезці ў СМІ са сваёй пазіцыяй".*

Як быццам гэтыя самыя грошы Кавальчук са сваёй кішэні даставаў і плаціў той жа Сашы Раманоўскай ці Андрэю Краўчанку. Міністэрства спорту – бюджэтная арганізацыя, якая ўтрымліваецца на грошы падаткаплацельшчыкаў. У тым ліку і на грошы тых беларусаў, хто пратэстуе супраць сфальсіфікаваных выбараў. І спартсмены, якія атрымліваць заробкі, маюць іх не за прыгожыя вочкі, а за сваю працу і вынікі.

Зрэшты, сёння час такі, што кожны робіць свой выбар і кожны сам адказвае перад уласным сумленнем.

Ёсць педагогі, якія гарой стаяць за сваіх вучняў, а ёсць настаўнікі, якія выклікаюць на тых самых вучняў АМАП.

Ёсць выкладчыкі, якія да апошняга абараняюць сваіх студэнтаў, але маюцца і такія, хто паказвае ім непрыстойныя жэсты.

Ёсць трэнеры, якія ніколі не здрадзяць сваім выхаванцам, а ёсць міністр, для якіх падначаленыя з "няправільнай" пазіцыяй – адпрацаваны матэрыял. Але ўпэўнены, што і для многіх спартсменаў такі міністр – проста пыл. Заўтра ніхто і не ўспомніць, што ён быў.

Алесь СІВЫ.

ЮБІЛЕЙ

Во власти мечты, или Не отрекаются любя

«Мара» – совместное детище влюбленных в танец людей, Макса и Лидии Кац. После смерти мужа Лидия Кац-Лазарева не дала «Маре» пропасть. И сегодня она по-прежнему делает все, чтобы танцевальная культура в Беларуси развивалась, чтобы у тех, кто приходит в клуб, мечты сбывались. В этом году «Мара» отмечает свое 55-летие.



Какой счастливый случай

– Иногда сама удивляюсь своему постоянству, – признается Лидия Петровна Кац-Лазарева. – В 1965 году приехала в Минск, зашла во Дворец культуры МТЗ, который тогда еще не приняла госкомиссия, и с тех пор другого места работы просто не представляю. Живу рядом, но настоящим домом считаю «Мару»…

– Лидия Петровна, когда и где вы приобщились к хореографии? Как родилась ваша любовь к танцу?

– Выросла я в Таганроге. Однажды моя подруга попросила пойти с ней на занятия по танцам – мол, она быстро освободится и мы вместе отправимся гулять. Я согласилась. О хореографии никогда не мечтала, считала себя недостаточно красивой, не обладающей внешними данными, которые необходимы для сцены и для выступлений перед публикой. Объяснения этому – в раннем детстве. Мне было два с половиной года, когда в доме случился пожар, я получила очень сильные ожоги, только чудом выжила. Это оставило свой след. Собиралась выбрать профессию, связанную с морем. Но в тот день мне, 14-летней девушке, очень понравилось, как ровесницы исполняют танго. Захотелось научиться двигаться так же красиво, как они. И я стала посещать эту школу. Меня заметили, я начала участвовать в концертах и конкурсах.



– Какими судьбами вы оказались в Минске?

– Танцевальные конкурсы в те далекие годы проходили в основном в Ленинграде, Каунасе, Вильнюсе, Риге. Оплачивать такие поездки для моих родителей, которые работали на заводе, стало сложно: в семье было еще два брата, жили мы очень скромно. И я, 18-летняя девушка, отправилась в Минск. К тому времени была уже лауреатом Всероссийского конкурса бальных танцев. Считала: буду поближе к главным культурным центрам страны, к Прибалтике, продолжу «танцевальный марафон» и поступлю в Институт иностранных языков. Студенткой не стала – не хватило полбалла. Но я твердо решила остаться в Минске и найти работу. Пришла во Дворец культуры МТЗ, нашла директора и предложила свои услуги – учить танцевать. Поскольку госкомиссия на тот момент помещение ДК еще не приняла, меня взяли на испытательный срок по договору подряда. И я на танцплощадке, на знаменитых «корчах» летом стала приобщать к польке, липси, венскому вальсу и вальсу-бостону всех желающих. Собирались тысячи минчан. А с 1 сентября 1965 года открыла в ДК школу бальных танцев – по аналогии с той, в которой сама занималась в Таганроге. Пришли восемь человек. Вот так началась моя биография хореографа. Несколько позже я получила профессиональное образование – и даже не одно.

История любви

– Лидия Петровна, а как и где вы познакомились со своим мужем?





К счастью для себя, я рано поняла: человек в этом мире по сути одинок и должен рассчитывать только на себя. Хочешь прожить интересно – значит, нужно верить в себя, в свое предназначение. Это поможет не сломаться в самые трудные минуты в жизни.

– Макс Самуилович Кац преподавал в танцевальной школе в Таганроге. Он потомственный хореограф. Сначала наша симпатия друг к другу не обещала перерасти в нечто большее. Все-таки между нами была заметная разница в возрасте. Но он приехал ко мне в Минск, и здесь мы поженились.

– Это была любовь учителя и ученицы?

– Долгие годы я считала его учителем во всем и даже дома называла по имени-отчеству. Макс Самуилович влюбил меня в танец, благодаря ему я нашла свое призвание. Он был для меня Мастером. Но в какой-то момент я «доросла» до него и почувствовала себя достойной ученицей. Наши творческие отношения цементировало общее дело – «Мара». А в семейном союзе мы более 25 лет старались слушать и слышать друг друга. Необыкновенно благодарна мужу за то, что он делился со мной жизненной мудростью, приобретенными знаниями, давал мне свободу развиваться, расти, совершенствоваться.

– Вы часто танцевали с мужем?

– Танцевали мы на вечерах, праздниках, встречах с друзьями. Особенно часто – в тех случаях, когда для популяризации «Мары» требовалось что-то показать, объяснить значение великого искусства хореографии.

– А муж не ревновал вас к тем партнерам, с которыми вы выступали?

– Хотя я никогда давала повода, иногда такое случалось. Но чаще на подобные вопросы о ревности муж отвечал: «Ну пускай потанцует. Уйдет домой она все равно со мной!» К 30 годам я оставила спортивно-концертное направление, и основной для меня стала педагогическая работа.

– Есть женщины, которые не могут жить без мужчины, а есть такие, кто легко переносит одиночество, кого оно не пугает. Вы из какой категории?

– Это большое счастье, если рядом есть кто-то, кто тебя понимает, с кем ты делишь радость и горе. Одиночество – это испытание, которое не каждому по плечу. Когда я овдовела, мне тоже первое время казалось: жизнь кончена. Но оставалась «Мара», и я заставила себя продолжать наше общее дело. К счастью, я рано поняла: человек в этом мире по сути одинок и должен рассчитывать только на себя. Хочешь прожить интересно – значит, нужно верить в себя, в свое назначение. Это поможет не сломаться в самые трудные минуты жизни.

– Вы были молодой вдовой. Не пытались устроить свою личную жизнь?

– Я и сейчас верю в романтические отношения. Не глядя на свои годы, нахожусь в процессе выбора спутника жизни. Он, как и я, должен верить: любви и танцу все возрасты покорны.

– Какие танцы, по вашим наблюдениям, пользуются наибольшим «спросом»?

– Вальс, танго, квикстеп. Я всячески внедряю, поверьте, и сальсу. Но почему-то люди разных возрастов предпочитают по-прежнему классику. Думаю, объяснение этому – в желании ощущать партнера и богатстве музыкального сопровождения.

– Лидия Петровна, вы сегодня уже только учите или иногда танцуете сами?

– Больше учу и учусь. Раз в год-два езжу на форумы лучших мировых педагогов по хореографии, слушаю лекции, чтобы быть в курсе современных тенденций и не останавливаться в развитии. Но иногда и танцую – со своими бывшими партнерами, с учениками, которые сегодня преподают в «Маре».

– Что вы любите, помимо танца?

– Водить машину, кататься на велосипеде, плавать в бассейне, сплавляться на байдарках, читать хорошие книги, слушать прекрасную музыку и пение, смотреть талантливые театральные постановки и фильмы. Люблю готовить. Без ложной скромности: я хорошая хозяйка, дорожу уютом, порядком, чистотой. Обожаю общаться с людьми, наблюдать за ними, узнавать, восхищаться. Ой, я столько всего в жизни люблю! Бывает, иногда просыпаюсь, чувствую: наваливается хандра, что-то побаливает, вспоминаются трудности. Тогда говорю себе: «Лазарева, а ну, брось прикидываться, всё у тебя хорошо, ты еще нужна людям, поднимайся – и вперед!».

– О чем мечтаете сейчас?


– Реализовать те идеи, которых у меня еще по-прежнему хватает. Передать свое дело в надежные руки, оставить после себя наследников-профессионалов, чтобы «Мара» жила в Минске сотни лет. А еще мечтаю о Дворце танца, где был бы учебный центр для занятий, костюмерная, кафе… Давно хочу, чтобы хотя бы в одной школе Минска с 1-го по 11-й класс внесли в расписание обязательные уроки танца. Мне кажется, это был бы шикарный социальный проект, который со временем стоило бы распространить на все учебные заведения страны. Пока, увы, не нашла поддержки для реализации этого эксперимента. Но все равно буду штурмовать «крепость» и верить: мечты сбываются!

Ольга ПОКЛОНСКАЯ.
Фото из архивов Л.Кац-Лазаревой.
«Алеся».

КРЫЖАВАНКА

Сельскія нататкі

Прысвячаецца работнікам сельскай гаспадаркі Беларусі



Па гарызанталі: 1.Плачуць па сонцу ў лістападзе … (прык.). 4."О, хлебаробы! Хлебапёкі! // За вашу працу – вам …!" – з верша Т.Дзям'янавай "Хлеб". 7.Вялікі … хлеба (разм.). 10."Як нагляджуся, дык прыгадаю // Поле без краю // Кожнага краю; // Тых, хто на полі // З лецейка ў …" – з верша П.Броўкі "Песня хлебу". 11.Увосень і верабей … варыць (прык.). 12.І свіння …, калі мукі скрыня (прык.). 13.Лёгкая празрыстая тканіна. 15."Печаная бульба – гэта …" – з верша П.Панчанкі "Бульба". 16."Тым часам … святы мінуўся, // І лес у чырвань апрануўся" – з паэмы Я.Коласа "Новая зямля". 20.Галава …, а языкоў дзесяць (прык.). 21.Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – … набярэцца (прык.). 24.Шлях транспартнага сродку. 25.Закончыш … ў пору, будзе што вазіць у камору (прык.). 28. … грэе чалавека (прык.). 32.Зямля – … , але і сама піць-есці просіць (прык). 34.Лістапад і …, і палоззе любіць (прык.). 35.Пасудзіна для чэрпання вады. 36.Галоднаму хлеб на вуме, а сытаму – … (прык.). 37.Кузьма і … – апекуны земляробства і вяселля, у гонар якіх 14 лістапада адзначалі свята. 38.Пустазелле з дробнымі белымі кветачкамі.

Па вертыкалі: 1.Сырасць. 2.Марская рыба сямейства ласасёвых. 3.Шырокая драўляная пасудзіна. 5. … ды вада – усяму галава (прык.). 6.Канцылярыя. 7.Невялікая капа. 8.Коннік, верхавы. 9.Тое, што і самасейка. 14.Не зважай на …: сей жыта – хлеб будзе (прык.). 17.На чорным полі белая … родзіць (прык.). 18. … рукам, што пахнуць збожжам! (Прык.). 19.Будзе хлеб – будзе і … (прык.). 22.Была б …, а даёнка знойдзецца (прык.). 23."А ў гародзе на градзе // Вырасла … .// За то мяне хлопцы любяць, // Што я весялушка" (прыпеўка). 26.Парадкавы лік прадмета. 27.Пчолка адзін … знае, толькі з адной сямейкай дажывае (прык.). 29.Адна … – два сярпы, дзве … – тры сярпы (прык.). 30.Кот на печ – … на двор (прык.). 31.Парны танец у рытме джазавай музыкі. 33.Пакуль … – патуль свет, пакуль рукі – патуль хлеб (прык.).

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Ваконцы. 5.Паклон. 8.Кус. 10.Лета. 11.Піва. 10.Лета. 12.Гаспадыня. 13.Ажур. 15.Казка. 16.Спас. 20.Адна. 21.Сена. 24.Рэйс. 25.Жніво. 28.Жарт. 32.Карміліца. 34.Колы. 35.Коўш. 36.Рай. 37.Дзям'ян. 38.Макрыца.

Па вертыкалі: 1.Вільгаць. 2.Кета. 3.Цэбар. 5.Агонь. 6.Офіс. 7.Копка. 8.Сядок. 9.Самасей. 14.Ураджай. 17.Пшаніца. 18.Хвала. 19.Песня. 22.Кароўка. 23.Пятрушка. 26.Нумар. 27.Вулей. 29.Ралля. 30.Сцюжа. 31.Блюз. 33.Вочы.

Лявон ЦЕЛЕШ.
г.Дзяржынск.

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.).
Отпечатано в АО «Прайм Принт Москва», 141707,МО, г.Долгопрудный, Лихачевский пр-д, 5В. Подписано в печать 02.11.2020 в 17.00. Объем 4 печ. листа. Тираж 30000 экз. Заказ №2986.